ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (1036) ● ЧАЦВЕР, 27 снежня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.






**Дарагія сябры!**

Мы развітваемся з адыходзячым годам і пакідаем за плячыма пэўны адрэзак свайго жыццёвага шляху. Ён застанецца ў памяці добрасумленнай працай, поспехамі ў вучобе, перамогамі ў навуцы, на будаўнічых пляцоўках і калгасных палетках. Адыходзячы год быў адзначан сардэчнай дружбай і цікавымі падарожжамі, новымі знаёмствамі са студэнтамі брацкіх рэспублік, моладдзю замежных краін, калегамі-вучонымі.

1973-ці папоўніць лік пражытага і стане прыступкай у стваральнае будучае.

Дык з Новым годам, сябры, з новымі здзяйсненнямі!

## ТВОРЧА, З ВЫДУМКАЙ

Новы год! Свята, да якога маюць дачыненне ўсе. Кожнаму ёсць што ўспомніць, над чым прызадумацца... Год жыцця... Як пражыў ты яго? Калі не так, як намячаў, не так, як хацеў,— не бяда. Існуе ж павер'е: як правядзеш свята Новага года, такім і будзе для цябе новы, 1974!

Студэнты-хімікі ой як вераць у гэта. Таму да Новага года рыхтуюцца з поўнай адданасцю і веданнем справы. Умеюць тут творча, з выдумкай наладзіць культмасавую работу. Вось і сёлета, як расказала адказная за культмасавую работу на факультэце Людміла Камарчова, на навагоднім свяце хімікаў будзе шмат цікавага. Яно адбудзецца ў кінатэатры «Піянер». Студэнты змогуць паглядзець вясёлыя мультфільмы, пазнаёмяцца з навагодняй праграмай факультэцкай агітбрыгады. Эстрадны ансамбль пад кіраўніцтвам Валерыя Будзько зробіць усё, каб свята прайшло весела.

А вось студэнты факультэта прыкладной матэматыкі паклапаціліся аб тым, каб свята было вясёлым не толькі ў іх. Агітбрыгада, адна з лепшых ва універсітэце, падрыхтавала спецыяльную праграму, з якой выступіць перад студэнтамі інтэрнатаў № 6 і № 7 па вуліцы Кастрычніцкай. А. Новікаў, загадчык культмасавага сектара, запэўніў, што праграма будзе цікавай.

**Ю. ШЫНКАР,**
**загадчык культмасавага сектара камітэта камсамола БДУ.**

Дэканат па навучанню замежных студэнтаў, савет дружбы і інтэрсектар камітэта камсамола БДУ горача і сардэчна віншуюць кубінскіх студэнтаў з 15-й гадавінай з дня перамогі кубінскай рэвалюцыі і абвяшчэння рэспублікі.

Віншуем таксама старшыню савета дружбы, студэнта V курса юрыдычнага факультэта Саміра Шахіна з нацыянальным святам яго радзімы—Днём незалежнасці Судана.

## ЯНЫ ЗАСЛУЖЫЛІ ПАВАГУ

На павестцы дня апошняга ў гэтым годзе камсамольскага сходу супрацоўнікаў ФПМ стаяла не зусім звычайнае пытанне: «Урачыстыя провады з радоў ВЛКСМ».

Сход адкрыў сакратар камсамольскай арганізацыі Валерый Пятровіч Кірліца:

— Сёння нам крыху сумна. Мы праводзім з камсамола двух нашых таварышаў: Валерыя Крахотку і Валерыя Шаліму. І не проста праводзім, а пакідаем ім на вечнае захаванне камсамольскія білеты і ўліковыя карткі. Яны заслужылі гэта.

Я раскажу пра Валерыя Крахотку, з якім разам вучыўся пяць год, а зараз працую на кафедры метадаў аптымальнага кіравання. Ён выдатна закончыў універсітэт, за два гады падрыхтаваў і абараніў кандыдацкую дысертацыю. Зараз Валерый Васільевіч— вучоны сакратар кафедры.

Не так даўно Валерый Васільевіч ездзіў на Кубу, чытаў лекцыі ў Гаванскім універсітэце. Кафедра атрымала станоўчы водгук аб яго рабоце. Мы жадаем Валерыю Васільевічу і надалей быць такім жа захопленым навукай і адданым ёй да канца.

Староста студэнцкай групы, член прафбюро і камітэта камсамола, камандзір народнай дружыны. Потым—добры выкладчык і куратар групы—такі шлях Валерыя Шалімы. Сябры ўручылі яму прывітальны адрас. У ім—пажаданне вечнай маладосці і поспехаў.

**Наш кар.**

Снег ідзе белы-белы,
сыпле срэбра на дрэвы,
сыпле срэбра пад ногі
на сцяжынкі, дарогі.
Людзі крочаць і крочаць,
срэбра снежнае топчуць,
не здзіўляюцца цуду:
ёсць такое ўсюды.
І чаму тут здзіўляцца—
гэта ж проста дзівацтва...
На далоні сняжынка
стала проста расінкай,
хітра мне падміргнула:
«Што, цябе падманула?»
Ад здзіўлення смяюся,
нават хтось азірнуўся:
«І знайшоў чым здзіўляцца —
гэта ж проста дзівацтва»...

**Валерый ВЫШКЕВІЧ,**
**студэнт юрыдычнага факультэта.**

# ТАЛЕНТ ЖЭНІ РАДЫЁН



Знайсці яе ў час перапынку ці пасля заняткаў амаль немагчыма. Усе яе бачылі, і ніхто не ведае, дзе яна.

Горкі вопыт мяне навучыў: за дзесяць хвілін да канца лекцыі падыходжу да адных дзвярэй аўдыторыі, ля другіх пакідаю сваю знаёмую, і мы разам пакутліва чакаем, калі пройдзе разам з натоўпам дзяўчат няўлоўная Жэня Радыён — адказная за культурна - масавы сектар хімічнага факультэта.

— Жэня, можна вас на хвіліначку?

— Калі ласка,— адказвае яна з гатоўнасцю.— Я да вашых паслуг.

Але пагаварыць не ўдаецца. Ля нас хутка сабраўся цэлы натоўп.

Стараста - першакурснік тузае яе за рукаў:

— Жэня, як устанавіць дзяжурства на вечары?

— Ваш курс не дзяжурыць. Дзяжурыць другі курс.

— А мне казалі...

— Не дзяжурыце вы.

Дзяўчатам з другога курса патрэбна паказаць партыю новай песні. Жэня тут жа ціхенька спявае, дзяўчаты паўтараюць.

— Жэня, а як наконт білетаў?

— Жэня, калі будзе хор?

Так, не зайздрошчу я ёй у гэты момант. Яна, нібы прачытаўшы мае думкі, жартоўна гаворыць:

— Адчапіцеся, адчапіцеся, дайце з чалавекам пагаварыць! — і паварочваецца да мяне:

— Але вы не падумайце, я не шкадую, што ўзяла гэты сектар. Ён самы клапатлівы, але ж і самы вясёлы. Праўда, бацькі мае супраць: маўляў, і дадому позна прыходзіш, і стамляешся, і часу табе вечна не хапае. Але ж гэта цікава!

Як вы думаеце, можа адзін чалавек арганізаваць самадзейнасць на факультэце? Не, скажаце вы. А я скажу зараз, што таксама не ведаю, як удалося гэта Жэні, але гэта так. Зараз самадзейнасць на факультэце стала больш арганізаванай. Пастаянныя рэпетыцыі хору, танцавальнага гуртка, агітбрыгады...

Не, Жэня не прыпісвае сабе ўсе заслугі. Ёй дапамагаюць супрацоўнікі кафедр. Усе практычныя пытанні наконт памяшканняў для правядзення вечароў, апаратуры вырашаюць яны. І яшчэ ёсць у яе надзейны памочнік — сяброўка, аднакурсніца Люда Камарчова, таксама адказвае за культурна-масавы сектар. Ды і ўсе рабяты адносяцца да самадзейнасці, як да любімай справы.

— Я ведаю, як на другіх факультэтах востра стаіць пытанне аб самадзейнасці,— гаворыць Жэня,— як на хор прыходзяць, спачатку пабываўшы ў дэканаце. Я не хачу так. Лічу, што з такімі людзьмі нічога добрага не зробіш. Няхай іх будзе менш, але па-сапраўднаму захопленых. Тады і справа спорыцца, і працаваць лягчэй.

Чалавек на сваім месцы... Як гэта здорава! Я гляджу на Жэню і зайздрошчу, падобраму зайздрошчу ёй і яе сябрам, усім, хто з ёю вучыцца, працуе, рэпеціруе.

Вось рабяты з чацвёртага і трэцяга курсаў. Члены агітбрыгады ў мінулую суботу ездзілі ў вёску Седча Пухавіцкага раёна з канцэртам. Ініцыятарам стварэння агітбрыгады была Жэня. Зараз усе яны захоплены мноствам ідэй, планамі будучых паездак, накідамі яшчэ не напісаных сцэнарыяў. І я ведаю, агітбрыгада будзе жыць і працаваць!

Не скажу, што Жэня — нейкі вельмі ўжо незвычайны чалавек, што яна адна можа зрабіць тое, з чым не спраўляецца часам і калектыў кіраўнікоў. Проста я лічу, у яе ёсць дзіўная якасць: захапляць людзей тым, чым яна захоплена сама, талент адкрываць таленты.

**Л. НІКУЛІНА.**
Фота аўтара.

ДОБРАЕ слова хочацца сказаць аб студэнтах-актывістах. Захопленыя, цікаўныя, бескарыслівыя, яны заўсёды наперадзе — у вучобе, навуковай рабоце, у грамадскіх справах...

А вось і прадстаўнік гэтай слаўнай кагорты. Знешне ён нічым не адрозніваецца ад іншых. Паружавелыя ад марозу шчокі, дружалюбная ўсмешка на твары. Вочы... (кажуць, што яны — люстэрка душы) незвычайна блакітныя, з іскрынкай нейкага патаемнага агеньчыка. Разважаючы, хлопец крыху зажмурвае іх, прыкладае руку да скроняў і... умомант адрывае яе. Фізік! Вось гэтак і называюць яго сябры — «наш фізік».

# ЧАС ВУЧЫЦЦА— ЧАС СТВАРАЦЬ

Яшчэ ў восьмым класе Саша адчуў, што фізіка—яго прызванне. І, не адкладваючы на пасля, пачынае з ёй усталёўваць цесныя сувязі. Наведвае створаную пры Акадэміі навук школу юных фізікаў. З цягам часу ён пераканаўся, што рашаць задачы—гэта яшчэ не сапраўдная фізіка... Але вось слухачоў размеркавалі па лабараторыях. Саша апынуўся ў чароўным, казачным свеце оптыкі. Тады якраз вялася эксперыментальная работа: з дапамогай імпульснага лазера даследаваліся нелінейныя уласцівасці асяроддзя. Асабліва уразіў момант «выстралу лазера». Глядзеў Саша на ўсё гэта вачыма навічка, разпораз узнімаў дапытлівы позірк на настаўніка і, магчыма,—у каторы раз!—адзначаў пра сябе, што яму суджана вучыцца на фізічным факультэце, а оптыка будзе яго спецыялізацыяй...

Зусім іншым заходзіць Аляксандр Кавалёў, студэнт IV курса фізфака, у лабараторыю зараз, калі за плячыма ёсць салідны багаж тэарэтычных і практычных ведаў, атрыманых у студэнцкіх аўдыторыях. Ён тут знаходзіць цяпер не проста цікавую, карпатлівую працу, а сэнс усяго свайго жыцця. У лабараторыі манціруецца плазменная ўстаноўка, з дапамогай якой вучоныя-фізікі будуць распрацоўваць новыя спосабы дыягностыкі плазмы, і Саша прымае непасрэдны ўдзел у гэтай рабоце, вядзе навуковыя даследаванні, выступае з дакладамі. З цікавасцю слухалі, напрыклад, аднакурснікі яго даклад аб вымярэнні часу патухання флуарэсцэнцыі. Канкрэтныя прыклады, пераканаўчыя довады, спакойная манера выкладання...

Кавалёў — выдатнік і навуковую работу расцэньвае як магчымасць ведаць больш, каб працаваць потым з большай аддачай.

Трэба дабавіць, што Саша не замыкаецца ў коле сваіх захапленняў. Таварышы па рабоце прыкмецілі ў яго характары рысы. уласцівыя важаку, і выбралі ў састаў камітэта камсамола, дзе Кавалёў узначаліў інтэрнацыянальны сектар.

А летам абавязкова ўбачыш яго прозвішча ў спісе байцоў будаўнічага атрада.

Неяк я сустрэла Сашу ў Тэатры юнага гледача. Свабодна і кваліфікавана расказваў ён аб артыстычным майстэрстве Б. Барысёнка, Р. Маленчанкі, У. Говара-Бандарэнкі. А яшчэ любіць хлопец беларускі тэатр імя Янкі Купалы.

Пад канец размовы задаю пытанне пра мастацкую літаратуру. І чую ў адказ: «Мне больш падабаюцца Чэхаў і Дастаеўскі. Іх творы вызначаюцца незвычайным драматызмам, глыбінёй псіхалагічнага аналізу, філасофскім насычэннем... І яшчэ фантастыка, у якой папулярызуюцца навуковыя гіпотэзы, прадказваюцца будучыя дасягненні навукі і тэхнікі».

«Вось вам і «фізік-лірык»,—падумала я.

Гэта ўсяго некалькі штрыхоў да партрэта аднаго з многіх, хто з'яўляецца гонарам факультэта, хто носіць гордае імя — студэнт-актывіст.

**Л. МІХАЛЕВІЧ.**

# УНІВЕРСІТЭТ З РАНІЦЫ ДА ВЕЧАРА

**Хутка, зусім хутка стары год перадасць свае правы Новаму — 1974. Што прынясе ён? Новыя клопаты, хваляванні, радасці. Студэнтам—новыя экзамены ў чарговую ці першую ў жыцці сесію.**

**А пакуль што каляндар адлічвае апошнія дні адыходзячага добрага года.**

**У студэнтаў III курса хімфака яшчэ ідуць практычныя заняткі па курсу фізічных метадаў у хіміі, якія вядзе асістэнт кафедры структуры рэчыва П. В. Кузаўкоў.**







# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ!

Узбуджаныя, радасныя твары студэнтаў-фізікаў. Сёння ў іх выдатная падзея — дзень нараджэння. Але не проста асобнага чалавека, сёння афіцыйны дзень нараджэння студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі метралогіі прыродных сістэм пры кафедры ядзернай фізікі. Менавіта тут будуць займацца яшчэ не вырашанымі ў навуцы пытаннямі — па-першае, пабудовай часавых радоў па розных прыродных з'явах па выніках радыёізатопнага і мікрааналізу гідралагічных утварэнняў у выглядзе закансерваваных ападкаў, палярных і горных ільдоў, што неабходна для прагназіравання, і, па-другое, вызначэннем і вывучэннем асноўных і другарадных законаў і сувязей у прыродзе, г. зн. складаннем своеасаблівага табеля аб рангах.

Дзень адкрыцця хвалюючы і для навуковага кіраўніка лабараторыі, кандыдата фізіка-матэматычных навук Аляксандра Міхайлавіча Люцко, і пяцікурснікаў Уладзіміра Сіроціна, Мікалая Яўменчыкава, Ірыны Прасандзеевай, трэцякурснікаў Юрыя Конанава, Аляксандра Сакалоўскага, Леаніда Сыркіна, Мікалая Катовіча, Васіля Ліпскага і многіх іншых.

На ўрачыстай цырымоніі прысутнічаюць таксама намеснік дэкана А. А. Лабуда, загадчык кафедры ядзернай фізікі, прафесар С. С. Шушкевіч, доктар фізіка-матэматычных навук У. Р. Барышэўскі, дацэнт В. Я. Ямны.

Усе ўсхваляваны. І толькі ледзяная дзева, што глядзіць на прысутных з аплікацыі, зробленай студэнтамі на сцяне лабараторыі, і якая ўвасабляе навакольнае асяроддзе, спакойна пазірае на ўсё, што адбываецца навокал.

Сёння дзень нараджэння не проста СНДЛ метралогіі прыродных сістэм — у сценах лабараторыі нараджаецца новая галіна навукі, нешта накшталт ядзернай геафізікі. І дзяўчаты ў падарунак імяніннікам паднеслі кветкі.

— Няхай цвітуць, напамінаючы вам аб той прыгажосці, у ахове якой вы, фізікі, павінны дапамагчы біёлагам і геабатанікам, — гаворыць Ларыса Гаварун.

А Ліда Шыханцова дадае:

— Дапамагчы ў ахове прыроды — гэта значыць стварыць сучасную і надзейную апаратуру, здольную працаваць у любых умовах, збіраць і адпаведным чынам апрацоўваць інфармацыю аб змяненні метэаралагічных умоў у вывучаемым раёне.

У такі дзень успамінаецца тое, што зроблена, і намячаецца тое, што патрэбна зрабіць.

Напамінкам аб зробленым у ліпені—жніўні гэтага года членамі СНДЛ (лабараторыя фактычна існуе з вясны, а сёння толькі атрымлівае прызнанне і новае памяшканне), што ўваходзілі ў састаў валожынскай і далёкаўсходняй экспедыцый, — будзе служыць прыгожы сувенір — крышталь кальцыту, прывезены з Прыморскага краю і паднесены ў якасці падарунка калектыву лабараторыі.



Член партбюро Яўген Аляксеевіч Паваркоў уручае студэнтам яшчэ адзін падарунак, бадай, ці не самы лепшы — інструменты для працы.

І хоць у светлым пакоі лабараторыі, застаўленым рознымі апаратамі і прыборамі, не гучыць урачысты туш, аднак сэрца кожнага перапаўняе радасць ад усяго, што адбываецца ў гэтую хвіліну.

Лабараторыя адкрыта, і перад студэнтамі, што ў ёй працуюць, адкрываецца шлях у невядомую краіну — а гэта ж вялікае шчасце ўдзельнічаць у яе пазнанні...

**Н. НОВІКАВА,**
**студэнтка.**

# УНІВЕРСІТЭТ З РАНІЦЫ ДА ВЕЧАРА



У аддзеле апрацоўкі літаратуры універсітэцкай бібліятэкі ў гэтыя пераднавагоднія дні — горача: бібліятэка атрымала многа новай літаратуры. Трэба размеркаваць яе па аддзелах...

Студэнцкі прафілакторый.

Ён таксама жыве чаканнем Новага году. Пяцікурснікі БДУ і радыётэхнічнага інстытута абмяркоўваюць, як лепш правесці навагодні баль, а ўрач Л. Луканская спяшаецца запэўніць свайго пацыента, што здароўе яго ў поўным парадку.

**Фотарэпартаж вялі Г. МАРОЗАЎ, Л. НОВІКАЎ, Д. ЧАХОВІЧ.**





# ВЯСЁЛАЯ СТАРОНКА

*Ніл ГІЛЕВІЧ*

## ХАВАЙМАСЯ, ТАТА!

Убачыў аднойчы ў кіно Ігарок,
як фарбаю твары малююць індзейцы,
і ў бацькі спытаўся (цікаўныя дзеці!):
— Навошта яны сябе мажуць знарок?
А бацька ў адказ:—Гэта значыць, яны—
да бітвы рыхтуюцца, сын, да вайны.
Назаўтра ж уранку, падняўшыся шустра,
малышак да бацькі ўляцеў у пакой:
— Хаваймася! Мама стаіць перад люстрам—
рыхтуецца йсці на кагосьці вайной!

## КАЛІ БАЦЬКУ ЧАКАЕ БЯДА

— Мой сын вучыцца паступае
на медыцынскі факультэт.
— Вар'ят! Бяда цябе чакае!—
усклікнуў роспачны сусед.
— Чаму бяда? Ці ж гэта кепска?
— Гэ, мой як толькі паступіў,
дык мне ўжо з першага семестра
курыць і піць забараніў!..

## НА ВУЛІЦЫ

— Вы знаеце, як толькі стрэну вас,
дык і Рамана ўспомню кожны раз.
— Рамана? Дзіўна мне, чаму Рамана?
Мы не падобны між сабой нічуць!
— О, безумоўна, але ён таксама
мне сто рублёў яшчэ не змог вярнуць.

## ПЕРАСТАРАЎСЯ

З забінтаванай галавой
ляжыць Пятро ў палаце.
Заходзіць сябра:
— Што з табой?
— Ох, не пытайся, браце!
Віталі шэфа мы гурмой,
і я ў паклон схіліўся,
а мой калега, бегемот,
на галаву мне ўзбіўся.

## ПЫТАННЕ Ў АДКАЗ

Бацька ушчувае вучня-сына:
— Знаеш, адчаго ссівеў я так?
Што сваруся на цябе няспынна
за ляноту за тваю, лайдак!
Сын унурыўся, зірнуў спадлоб'я
і спытаў, не ўзняўшы галавы:
— Калі гэта ўра мяне—дык добра:
адчаго тады мой дзед сівы?

## ЗУСІМ ДРУГАЯ СПРАВА

Стрэўшы сына каля аўтамата,
што цукеркі прадае за дробязь,
абурыўся і ўзлаваўся тата:
— Марнатраўцы толькі гэтак робяць!
Колькі гаварыць мне, недаверак,
што псуюцца зубы ад цукерак?
І сказаў сынок у апраўданне:
— Тата, гэты аўтамат-разявя
за фальшывы грывенік прадаў мне...
— А-а, тады зусім другая справа!

## «СЯСТРА»

Дзяўчына ў бальніцы
нікога не знала,
і ў белым халаце
жанчыну спаткала.
— Прабачце, учора
прывезлі ў гарачцы
Драздa Мікалая—
ці можна пабачыць?
Зірнула жанчына:
— А хто вы такая,
што просіце стрэчы?
— Сястра Мікалая!
Руку працягнула
жанчына ў халаце:
— То будзем знаёмы:
а я — яго маці!

Патаемныя падазрэнні пачынаюць мучыць выкладчыка. А., у якога студэнт К. у час заліку папрасіўся пакурыць і вось ужо другі дзень не вяртаецца. Атмасферу непаканаласці усугубляе той факт, што студэнт К. не курыць, а таксама тыя абставіны, што ён узяў з сабою партфель.

***

Студэнт (шчыра перажываючы): Ведаеце, вось толькі што ў калідоры я гэтае пытанне назубок ведаў.

Экзаменатар: Ну што ж, давайце разам выйдзем у калідор...

***

На экзамене па фізіцы экзаменатар падаў студэнту лінзу і папрасіў паказаць фокус лінзы. Студэнт крыху падумаў і адказаў:

— Я ж прыйшоў экзамен здаваць, а не фокусы паказваць.

***

Напярэдадні сесіі яму прыйшла ў галаву думка, але, не заставшы там нікога, пайшла.

***

— Як можна да такой ступені нічога не ведаць?

— Прабачце, прафесар, я думаў, што экзамен адбудзецца толькі заўтра.

***

Студэнт: А можа, прафесар, над гэтым пытаннем разам падумаем? Розум добра, а два лепш.

## МАТЭМАТЫКІ ЖАРТУЮЦЬ

**(некалькі карысных парад дае першакурсніку клуб «Дэльта»)**

Парада 1. Калі вы не ў ладах з выкладчыкам, то пастарайцеся перайсці ў тую групу, якую ён курыруе: адносіны да вас будуць строгімі, але бацькоўскімі (мацярынскімі).

Парада 2. Памятайце, што, не ведаючы прадмета, цяжка знайсці агульную мову з выкладчыкам, асабліва калі мова замежная.

Парада 3. Чытайце дадатковую літаратуру. Нават калі вы ў ёй нічога не зразумееце, то навучыцеся правільна пісаць прозвішчы вядомых матэматыкаў.

Парада 4. Калі вы атрымалі вынік на ЭВМ, не спяшайцеся радавацца: спачатку знайдзіце тую памылку, у выніку якой ваша праграма прайшла.

**(З насценгазеты «Алгарытм», ФПМ).**



Без слоў.

Малюнак Т. ЗАСІМ.

# ЯК ДАСЯГАЮЦЬ ВЯРШЫНЬ

Высокія вынікі... Аб іх патаемна марыць кожны хто мае хоць самае малое дачыненне да спорту. А як жа іх дасягаюць?

Я размаўляю з Наташай Мяснікавай, студэнткай IV курса, майстрам спорту па валейболу.

— Як пачалася ваша спартыўная біяграфія?

— Упершыню на валейбольную пляцоўку я трапіла, калі вучылася ў 8-м класе, дзякуючы майму росту. Трэба было выступаць за зборную школы. Толькі не падумайце, што я іграла лепш за маіх аднакласнікаў... Падаць мяч для мяне было праблемай! Затым пайшла займацца ў секцыю валейбола. Мяч «прыручаўся» паволі і цяжка. Таму на першыя трэніроўкі збіралася са слязьмі, але ўсё-такі ішла — я дала слова, што буду займацца валейболам сур'ёзна.

Чым больш трэніравалася, тым больш мне падабаўся спорт, асабліва ігравы. І не шкада было затрачанай працы, таму што бачыла яе вынікі, адчувала вялікую радасць ад кожнай добрай перадачы, трапнага нападаючага удара. Увесь свабодны ад вучобы час гатова была праводзіць у игравой зале.

Мне было 20 год, калі мяне запрасілі ў каманду вышэйшай лігі г. Адэсы. Яшчэ праз год увайшла ў састаў зборнай Савецкага Саюза. Дзе мне толькі не прыходзілася іграць! У Балгарыі, Польшчы, Японіі... А на карце нашай краіны для мяне ужо амаль няма «белых плям».

— Якая ігра вам больш за ўсё запомнілася і чаму?

— Сустрэча з японскай камандай фірмы «Нічыбо» на міжнародным турніры ў Балгарыі. Ігра японскіх спартсменак для мяне стала эталонам. Выключная тэхніка, самаадданая абарона, незвычайная воля да перамогі. Дзяўчаты з «Нічыбо» не проста марылі, яны вырашылі стаць чэмпіёнкамі свету. І на шляху да перамогі упарта пераадольвалі ўсе перашкоды, забывалі пра адпачынак, зналі толькі доўгую, знясільваючую працу. З самага ранку— на фабрыцы. А ўвесь астатні час, амаль да часу ночы, — у игравой зале, дзе сотні разоў трэба паўтараць адно і тое ж практыкаванне, адпрацоўваць адну і тую ж перадачу.

Выйграць у такога праціўніка — справа нялёгкая.

— Аб чым вы падумалі, калі прагучаў фінальны свісток?

— Я цвёрда вырашыла тады: «Калі ўжо прайграць, то толькі па-нічыбоўску».

— Хоць коратка раскажыце, дзе і як вы трэніруецеся цяпер?

— Трэніруюся з камандай майстроў спартыўнага таварыства «Спартак» пад кіраўніцтвам ганаровага майстра спорту Генадзя Міхайлавіча Янава. Займаюся не менш 12 гадзін у тыдзень. Прыходзіцца нялёгка, бо вельмі хочацца быць і добрым юрыстам.

— Як вам удаецца і займацца спортам, і часта выязджаць на спаборніцтвы, і ў той жа час добра здаваць сесіі? Да таго ж, вы замужам...

— Можа, я і не змагла б, але дзякуй групе! Яна ніколі не адмаўляе мне ў дапамозе, асабліва Барыс Васканян, Віктар Чырык, Тамара Краўцова. Ды і спорт выпрацоўвае сілу волі, настойлівасць, уменне думаць.

— Наташа, а цяпер давайце як бы падвядзем вынік. Што ж усё-такі галоўнае ў вучобе і спорце: здольнасці, асаблівыя фізічныя даныя ці праца, воля?

— Канешне ж, толькі ад самога чалавека залежыць, ці дасягне ён высокіх вынікаў у вучобе ці спорце. Патрэбна ўпартая, паўсядзённая праца, без яе не абысціся. Не будзеш нічога рабіць — ніколі і не даведаешся, ці ёсць у цябе гэтыя самыя даныя, здольнасці.

**Н. МАЗАЛЯКА.**

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз.
Газета выходзіць па чацвяргах.
Аб'ём — 1 друк ар.

Наш адрас: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 20133

Зак. 1563.